**Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і**
М 54 **літаратуры ў школе і ВНУ**: зб. навук. арт. / пад рэд. І. У. Таяноўскай, Т. В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – Вып. 5. – 110 с.

***І. М. Саматыя***

# РАБОТА З ТЭКСТАМ ЯК ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ КАНТРОЛЮ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Навучанне роднай мове ў айчыннай методыцы заўсёды разглядалася ў непарыўнай сувязі з развіццём і выхаваннем вучня. Метадычным сродкам, які служыць асновай для стварэння не толькі навучальнага, але і развіццёвага асяроддзя, з’яўляецца тэкст. Па словах М. М. Бахціна, "чалавек у яго чалавечай спецыфіцы заўсёды выражае сябе (гаворыць), гэта значыць стварае **тэкст**... Усякі па-сапраўднаму творчы тэкст ёсць у нейкай меры вольнае... адкрыццё асобы" [1, с. 477].

Адным са спосабаў такога "адкрыцця асобы" можа стаць работа з тэкстам як форма правядзення вуснага кантролю па засваенні ведаў і выпрацоўцы ўменняў і навыкаў вучняў па роднай мове. Настаўнікі-моваведы, якія навучаюць роднай мове не як зводу правіл, а як способу мыслення, магутнаму сродку эстэтычнага, духоўнага развіцця школьнікаў, бачаць асобы сэнс у выкарыстанні на ўроках заданняў, скіраваных на асэнсаванне таго, як жывуць вывучаемыя моўныя з’явы ў маўленні, у тэксце, якая багатая і разнастайная наша мова. Такія настаўнікі лічаць, што вусны кантроль ў форме працы з тэкстам дазваляе быць больш гуманным у адносінах да вучня, выклікае творчыя адносіны школьніка да вывучанага матэрыялу. Дадзеная форма кантролю (тэматычнага, прамежкавага, выніковага) дазваляе пачуць даволі глыбокія звязныя адказы, якія адлюстроўваюць веды вучняў па пройдзеных раздзелах сістэматычнага школьнага курса беларускай мовы. Пры такой форме праверкі вучань – даследчык тэксту, ён праяўляе свае творчыя здольнасці. Дзеці атрымліваюць задавальненне ад кантрольнай работы: яны многае адкрываюць для сябе ў тэксце, заслужана атрымліваюць сваю адзнаку. Такая форма кантролю выключае магчымасць выкарыстання шпаргалак.

Работа з тэкстам як форма вуснага кантролю вымагае ад вучня не толькі ведаць увесь матэрыял (па толькі што пройдзенай тэме; па тэмах, якія вывучаліся на працягу чвэрці, паўгоддзя ці вучэбнага года), але і без падказкі настаўніка (у выглядзе прапушчаных знакаў прыпынку, літар і інш.) умець прымяніць гэтыя веды на практыцы. Напрыклад, ведаць не толькі канкрэтнае правіла, але і знайсці на гэтае правіла слова (словы) у тэксце, растлумачыць напісанне; вызначыць, наколькі складаны гэты тэкст з пункта погляду арфаграфіі ці пунктуацыі, згрупаваць арфаграмы і пунктаграмы. Патрэбна вельмі добра разбірацца ў вывучаным матэрыяле.

На кантрольным уроку кожнаму вучню прапануецца тэкст з заданнямі да яго. Заданні да тэксту падабраны такім чынам, каб дапамагчы школьніку скласці звязны маналагічны тэкст. Тэксты адрозніваюцца стылем, тыпам

маўлення, лексікай, разнастайнасцю сінтаксічных канструкцый, наборам пунктаграм і арфаграм.

Фармулёўка заданняў да тэкстаў залежыць ад канкрэтнай тэмы, ад віду кантролю і інш. Прыкладам такога віду працы можа быць практыкаванне № 465 з падручніка па беларускай мове [2, с. 276–277].

Набор заданняў можа быць і іншым:

1. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання тэксту.
2. Дакажыце, што дадзены ўрывак з’яўляецца тэкстам.
3. Як звязаны сказы ў гэтым тэксце? Якія сродкі сувязі тут выкарыстаны?
4. Да якога тыпу маўлення адносіцца дадзены тэкст (апавяданне, апісанне, разважанне)?
5. Вызначце стыль тэксту, абгрунтуйце сваю думку.
6. Вызначце тэму, асноўную думку тэсту.
7. Падбярыце да тэксту загаловак, які выражае: а)асноўную думку; б) тэму тэксту.
8. Складзіце план тэксту.
9. Растлумачце, карыстаючыся слоўнікам, значэнні падкрэсленых слоў.
10. Падбярыце да выдзеленых слоў сінонімы, антонімы. Чым адрозніваюцца словы, якія ўваходзяць у рад сінонімаў?
11. Знайдзіце ў тэксце  2-3 мнагазначныя словы словы. У якіх значэннях яны выкарыстаны?
12. Зрабіце фанетычны разбор любога слова.
13. 2-3 словы разбярыце па саставу, вызначце спосаб словаўтварэння.
14. Любое слова разбярыце як часціну мовы.
15. Якія арфаграмы сустрэліся ў словах тэксту? Як іх можна згрупаваць?

Перад вучнем ставіцца задача падрыхтавацца да звязнага адказу па аналізе тэксту, кіруючыся прапанаванымі пытаннямі і заданнямі як прыкладным планам. Вучні размяркоўваюцца на групы па пяць-шэсць чалавек. Дзевяцікласнікі  "выцягваюць" картку з тэкстам і заданнямі.На працягу адведзенага часу (залежыць ад колькасці заданняў) рыхтуюцццца да адказу, затым кожнаму прапануецца слова. Настаўнік не перапыняе вучня, выслухоўваючы адказ, даючы магчымасць іншым вучням стаць як бы членамі "экзаменацыйнай" камісіі: задаваць пытанні, дапаўняць адказ, выпраўляць памылкі. Перавага такой формы кантролю ў тым, што вучні адчуваюць сябе ўпэўнена, таму што ведаюць, што ад іх патрабуецца і што ўзровень цяжкасці (пры правядзенні розных відаў разбору) яны могуць выбраць для сябе самастойна. Пры адказе атрымліваецца агульная, цікавая для ўсіх размова, якая мае навучальны характар.

Такая форма адказу дазваляе пачуць даволі глыбокія звязныя адказы, якія адлюстроўваюць веды вучняў па ўсім курсе беларускай мовы. Пры такім адказе вучань становіцца даследчыкам тэксту, праяўляе свае творчыя здольнасці.

Падрыхтоўку да кантрольнай працы можна арганізаваць і па-іншаму. Напрыклад, на дошцы запісваецца план работы з тэкстам:

1. Выразна прачытай тэкст.
2. Вызначы тэму тэксту, ідэю, падбяры загаловак (калі яго няма).
3. Вызначы стыль тэксту і яго тып.
4. Вызначы лексічнае значэнне выдзеленага слова.
5. Ці ёсць у тэксце мнагазначнае слова, запазычанае (папрацуй са слоўнікамі)?

6. Падбяры сінонімы, антонімы да якога-небудзь слова.

7. Абазнач графічна найбольш складаныя арфаграмы.

1.Выканай пунктуацыйны разбор некалькіх сказаў. Якія пунктуацыйныя правілы можна праілюстраваць прыкладамі з тэксту?

2.Выканай розныя віды граматычнага разбору (на свой выбар).

Атрымліваючы картку з тэкстам, школьнік сам выбірае з плана тыя пытанні, якія адпавядаюць узроўню яго падрыхтоўкі і асаблівасцям прапанаванага тэксту. Пры ацэнцы адказу ўлічваецца ўзровень цяжкасці слоў і сказаў, выбраных вучнем для разбору.

Улічваючы асаблівасці класа (базавы, павышаны ці паглыблены ўзровень), інтарэсы вучняў, узровень падрыхтоўкі, від выніковага кантролю [3], можна прапаноўваць тэксты рознага аб’ёму, неаднолькавыя па ўзроўні цяжкасці, з рознай колькасцю пытанняў і заданняў.

У план работы з тэкстам першым уключаецца заданне на падыхтоўку выразнага чытання. Як адзначае прафесар В. У. Протчанка, "чытанне развівае мову і моватворчую сістэму дзіцяці, яго памяць, аналітыка-сінтэтычныя здольнасці, абуджае эмацыянальны настрой, дапамагае лепш асэнсаваць навакольны свет, садзейнічае выхаванню пачуццяў, самастойнасці, увагі і памяці, з’яўляецца крыніцай, што забяспечвае эстэтычны густ, іншыя асобасныя якасці і запатрабаванні навучэнцаў" [4, с. 124]. Пачынаючы свой адказ з выразнага чытання, да якога вучань папярэдне рыхтуецца, ён ужо паказвае вынікі саёй аналітычнай працы. Добрае, правільнае, выразнае чытанне ўслых не толькі сведчыць пра сфарміраванасць навыку чытання, але і патрабуе канкрэтнай падрыхтоўкі з улікам асаблівасцей канкрэтнага тэксту: патрэбна выбраць адпаведны тон, зыходзячы з аналізу зместу тэксту, тэмы, асноўнай думкі; прааналізаваць пунктуацыю, структуру сказаў, каб знайсці месца паўз, кароткіх і больш працяглых, знайсці словы, якія выдзяляюцца з дапамогай інтанацыі, лагічнага націску. Нарэшце, перад кожным вучнем стаіць важная камунікатыўная задача: прачытаць тэкст і пабудаваць свой адказ так, каб было цікава слухачу.

Вучні маюць магчымасць паказаць, наколькі яны авалодалі беларускай мовай, навыкамі маналагічнага маўлення, ці ўмеюць дакладна перадаваць свае думкі, пераконваць у сваёй праваце. Вельмі важна, што такая праца з тэкстам дазваляе вучням не толькі паказаць свае веды ў розных відах моўнага разбору, а і ўбачыць, якімі моўнымі сродкамі карыстаюцца пісьменнікі. Іменна ў гэтым, а не толькі ў перадачы тэарэтычных палажэнняў падручніка бачыцца прымяненне школьнікамі атрыманых на ўроках роднай мовы ведаў.

Адзначым, што ў 2005 годзе на цэнтралізаваным тэсціраванні па рускай мове ўзровень засваення асноўных маўленчазнаўчых паняццяў (тэкст, тэма, асноўная думка, мэта выказвання, тыпы маўлення, жанры маўлення), а таксама ступень сфарміраванасці важных камунікатыўных навыкаў (чытаць і разумець прачытанае, аналізаваць тэкст з пункту погляду тэматычнага, кампазіцыйнага і стылістычнага адзінства, вызначаць сродкі сувязі паміж сказамі ў тэксце) правяраліся з дапамогай чатырох заданняў у частцы тэста В.

Метадысты, эксперты прыйшлі да вываду, "што ў многім прычынай нізкіх вынікаў з’яўляецца недастатковая сфарміраванасць такога агульнавучэбнага навыку, як уменне чытаць і адэкватна ўспрымаць прачытанае" [5, с. 52]. У экзаменацыйнай рабоце 2005 года аб’ём тэксту для аналізу быў павялічаны прыкладна ў тры разы і ў ім было прапанавана заданне, у аснове якога ляжаў сэнсавы і кампазіцыйны аналіз. Варыянты заданняў былі наступнымі:

1. Вызначыць свярджэнне, якое адпавядае (не адпавядае) пазіцыі аўтара.
2. Вызначыць падтэму, якую не закранае аўтар.
3. Выявіць, які з варыянтаў загалоўка адпавядае асноўнай думцы тэксту.
4. Вызначыць, з якой мэтай аўтарам створаны тэкст.
5. Аднавіць правільную паслядоўнасць пунктаў плана.

Аўтарамі зборніка "Централизованное тестирование: 2005: Анализ. Выводы. Рекомендации. Тесты / Н.В.Самедава [и др.]; под ред. Н. С. Феськова" праведзены грунтоўны аналіз і на яго аснове зроблены вывады аб "неабходнасці ўзмацнення працы над маўленчазнаўчымі паняццямі, без якіх немагчыма фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі" [5, с. 54].

Правядзенне выніковага кантролю па новай форме – работа з тэкстам – не толькі дае магчымасць ацаніць вынікі навучання, узровень сфарміраванасці ўменняў і навыкаў, прадугледжаных праграмай, а і мае навучальны характар. Працуючы з тэкстам, школьнік можа паказаць свае ўменні і навыкі, прымяняючы веды за ўвесь школьны курс беларускай мовы. Таму што тэкст – катэгорыя, якая паказвае мову ў дзеянні, гэта адзінка мовы і маўлення, якая ітэгруе значэнне ўсіх іншых адзінак.

Дзейнасць вучня як пры падрыхтоўцы да кантрольнай працы, так і пры яе правядзенні мае творчы характар. Ствараюцца ўмовы для ажыццяўлення дыферэнцыраванага падыходу да вучняў. Менш падрыхтаваны вучань, выбраўшы з плана работы з тэкстам пытанні, даступныя для яго, справядліва атрымлівае свой бал. Моцны вучань можа ўключыць у адказ больш складаныя пытанні, зрабіць больш поўны аналіз, выбраць для разбору матэрыял, цікавы для яго.

Аналіз тэксту мае на ўвазе апору не толькі на веды, але і на моўную чуйнасць, маўленчую інтуіцыю, без чаго немагчымы працэс удасканалення маўлення.

Работа з тэкстам як форма выніковага кантролю па беларускай мове адпавядае сучасным патрабаванням да выкладання,знаходзіцца ў адпаведнасці з накіраванасцю навучання на маўленчае развіццё школьнікаў, з’яўляецца даступнай для большасці настаўнікаў і школьнікаў, не выклікае іх перагрузкі, таму што ўключае традыцыйны від дзейнасці – работу з тэкстам, слоўнікамі і стварае ўмовы для выкарыстання розных варыянтаў, выбару іх з улікам узроўню падрыхтоўкі вучняў, іх інтарэсаў, этапа навучання.

## *Літаратура*


1. *Бахтин, М. М.* Проблема текста в лингвистике, филологии и других гуманитарных науках // Литературно-критические статьи / М. М. Бахтин. – М., 1986.
2. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання (базавы і павышаны ўзроўні) / Л. А. Антанюк [і інш.]. – Мн.: НІА, 2006.
3. Десятибалльная система оценки результатов учебной деятельности учащихся в учреждениях, обеспечивающих получение общего среднего образования: Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі // Настаўніцкая газета. – 2003. – 5 жніўня.
4. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн.: НІА, 2001.
5. Централизованное тестирование: 2005: Анализ. Выводы. Рекомендации. Тесты / Н. В. Самедава [и др.]; под ред. Н. С. Феськова; Респ. ин-т контроля знаний Мин-ва образования Респ. Беларусь: в 2 ч. – Ч. 1: Беларуская мова. Русский язык. История Беларуси. Человек. Общество. Государство. Иностранные языки. – Мн.: РИКЗ, 2006.